До начала XXI века – 162 дня



ГОМЕЛЬСКАЯ ПРАЎДА

22 ліпеня 2000 г. Субота № 85 (20551)

Абласная газета. Заснавана ў 1917 годзе • Тыраж 26216 • Цана 50 руб.

НАПЯРЭДАДНІ ПАДЗЕІ

Здаць экзамен Прэзідэнту

Справаздачу аб стылі і метадах работы Гомельскага аблвыканкама і гарравыканкамаў па сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёну і мінімізацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС плануецца заслухаць 4 жніўня з удзелам Прэзідэнта краіны. Гэта будзе другое сёлета такое мерапрыемства, на якім кіраўнік дзяржавы прыме ў мясцовай вертыкалі своеасаблівы экзамен. Першае аналагічнае выязное пасяджэнне адбылося 21 студзеня ў Магілёве.

Каменціруючы па просьбе карэспандэнта БЕЛТА маючую адбыцца падзею, намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення арганізацыйнага забеспячэння Адміністрацыі Прэзідэнта Галіна Аверкіна адзначыла, што справаздачы старшынь аблвыканкамаў перад Прэзідэнтам краіны практыкаваліся і раней. Аднак яны праводзіліся па выніках работы рэгіёнаў за паўгоддзе і праходзілі ў фармаце "сам-насам". Пасля такіх сустрэч усе закранутыя на іх праблемы браліся ў Адміністрацыі Прэзідэнта на кантроль і праз пэўны час кіраўніку дзяржавы прадстаўляўся даклад аб ходзе рэалізацыі яго даручэнняў. Такая практыка, паводле слоў Галіны Аверкінай, існавала на працягу двух гадоў. Затым Прэзідэнт выступіў з ініцыятывай праводзіць такія мерапрыемствы публічна, з прыцягненнем вышэйшых службовых асоб краіны і кіраўнікоў мясцовай вертыкалі. У Магілёве і была ўпершыню рэалізавана прапанова кіраўніка дзяржавы.

Новаўвядзенне адразу ж даказала сваю эфектыўнасць. Галіна Аверкіна асабліва адзначыла факт надання мерапрыемству прыкладнога характару, калі многія з праблем, што ўзнімаліся, вырашаліся практычна ў ходзе справаздачы. Прысутнасць у зале міністраў, старшынь дзяржаўных камітэтаў, кіраўнікоў гаррайвыканкамаў і буйных прадпрыемстваў давала магчымасць у форме перакрыжаванага абмеркавання пытання выйсці на аптымальныя шляхі яго вырашэння. І важна, што ўсё гэта адбывалася, як кажуць, на вачах жыхароў рэспублікі, бо справаздача ў прамым эфіры транслiравалася па нацыянальных тэле- і радыёканалах. Кожны жадаючы мог, што называецца, нябачна прысутнічаць у зале і ацэньваць работу кіраўнікоў розных рангаў.

Схема правядзення справаздачы Гомельскага аблвыканкама будзе ў асноўным такой жа, як і Магілёўскага, сказала Галіна Аверкіна. Аднак ёсць і некаторыя новаўвядзенні. Па ініцыятыве кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Міхаіла Мясніковіча, задоўга да зацвярджэння даты справаздачы ўтворана рабочая група, якая выехала ў Гомельскую вобласць і правяла дэталёвае вывучэнне развіцця рэгіёну па ўсіх напрамках. Затым з удзелам прадстаўнікоў Савета Міністраў і вучоных быў праведзены аналіз падрыхтаваных матэрыялаў, на аснове якіх зроблены неабходныя прапановы і рэкамендацыі. Важная дэталь маючай адбыцца справаздачы — у поле зроку Прэзідэнта ўжо які раз трапляе чарнобыльскі рэгіён, дзе людзям асабліва цяжка жывецца і дзе павінны пастаянна адчуваць падтрымку дзяржавы. Такое, як вядома, крэда кіраўніка нашай дзяржавы. Дарэчы, напярэдадні пасяджэння, дзе прагучыць справаздача гамяльчан, Аляксандр Лукашэнка па традыцыі наведае шэраг народна-гаспадарчых аб'ектаў вобласці, сустрэнецца з простымі людзьмі, каб пачуць іх думкі і прапановы.

Паводле слоў намесніка начальніка Галоўнага ўпраўлення арганізацыйнага забеспячэння Адміністрацыі Прэзідэнта, справаздачы кіраўнікоў абласной вертыкалі ўлады і іх намеснікаў праводзяцца не для таго, каб з кім-небудзь "разабрацца", неадкладна вырашыць кадравыя пытанні. Важна знайсці аптымальныя рашэнні праблем. Але пры гэтым нядбайныя работнікі наўрад ці змогуць адчуваць сябе спакойна, бо Прэзідэнт заўсёды патрабуе вельмі строга ад тых, хто працуе спусціўшы рукавы.

Пасля Гомельскай вобласці экзамен перад Прэзідэнтам па выніках 2000 года будзе трымаць Міншчына. Плануецца, што справаздачу яе кіраўніцтва заслухаюць у канцы студзеня наступнага года.

Віктар ЛОЎГАЧ, БЕЛТА.

ЗЯЛЁНАЕ ЖНІВО

Удосталь корму — зіма не спалохае



Кармоў на зімовы стойлавы перыяд для грамадскага статку калектыўна-долевай гаспадаркі "Лапацінская" Гомельскага раёна патрабуецца няшмала. На плану трэба нарыхтаваць не менш 1300 тон сена (з улікам забяспечанасці і асабістых падвор'яў), 2700 тон сенажу. Да гэтых лічбаў дабаўляецца яшчэ нарыхтоўка сіласу і каранеплодаў. Не менш як па 15 цэнтнераў кармавых адзінак на ўмоўную галаву жывёлы адных толькі грубых кармоў намераны назапасіць працаўнікі гаспадаркі.

І таму на сенажацях кожны спрыяльны па надвор'і час ідзе напружаная праца. З першага ўкосу ў гаспадарцы атрымалі добрую траву, праўда, менш, чым разлічвалі. Але цяпер, пасля добрых дажджоў, травы добра пайшлі ў рост, даюць важкія тоны сена і сенажу.

Штодня на лугах у "Лапацінскай" працуе шмат тэхнікі. Зладжана ідзе работа ў механізатараў У. Іванюшына, І. Бысоцкага, В. Разувана і Р. Асіпенкі. Двое апошніх, працуючы на трактарах МТЗ з прэс-падборшчыкамі, нарыхтоўваюць за змену не менш чым на 40 — 50 тон сена ў рулонах.

М. БЯЛЬКОВІЧ.



НА ЗДЫМКАХ: "баявы" настрой у Віктара Разувана; на сенажаці гаспадаркі. Фота аўтара.

Візіт Паўла Шыпука на Гомельшчыну

— На сваё роднае прадпрыемства "Гомельшкло", — сказаў нам старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь П. У. Шыпук, — заўсёды прыязджаю з радасцю, як дадому.

І гэта ўпаўне зразумела: пасля заканчэння інстытута ён атрымаў тут пуцёўку ў працоўнае жыццё, прайшоў за 22 гады работы шлях ад майстра да дырэктара завода. Тут ён ведае амаль кожнага працаўніка, даражыць давер'ем і павагай людзей да яго не толькі як да былога кіраўніка прадпрыемства, але і палітычнага дзеяча. І на гэты раз Павел Уладзіміравіч з вялікай зацікаўленасцю выслухоўваў рабочых і спецыялістаў аб стане спраў на прадпрыемстве, заработнай плаце, умовах работы і быту.

Разам з ім на завод прыехалі першы намеснік старшыні аблвыканкама С. С. Сідорскі і начальнік галоўнага ўпраўлення будаўнічых матэрыялаў Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва М. Ф. Грынько. У суправаджэнні дырэктара ААТ "Гомельшкло" У. А. Запольскага яны наведалі ўчасткі вытворчасці, знаёміліся са станам спраў. Адзначана, што вялікі ўрон прадпрыемству нанесла аварыя на шклаварнай печы (аб гэтым наша газета расказвала), у выніку чаго яна была спынена. Трэба аддаць калектыву завода належнае: зроблена ўсё, каб аднавіць работу. Зараз паліраванага шкла выпрацоўваецца 650 тон у суткі. Праз некаторы час цэх выйдзе на праектную магутнасць — 800 тон.

На поўную сілу працуюць на заводзе тры ўстаноўкі па выпуску шклатары (бутэлек), дзе ў рабоце няма збояў. Але пералік добрых спраў не выключае наступнага вываду: сёння прадпрыемства з-за шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын апынулася ў даволі складаным становішчы. Аб гэтым днямі ішла размова на няпланавым пасяджэнні калегіі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, дзе заслухоўвалася справаздача кіраўніка завода. І каб дапамагчы калектыву прадпрыемства вырашыць рад праблем, звязаных з разлікамі за газ і электраэнергію, узаемадзеяннямі з партнёрамі, рэалізацыяй прадукцыі, трэба было намеціць правільныя арыенціры, знайсці шляхі выхаду на перадавыя рубяжы.

З гэтай мэтай і была праведзена на заводзе рабочая нарада, на якой абмеркаваны многія пытанні і выслуханы канкрэтныя рэкамендацыі і парады, што далі калектыву П. У. Шыпук, С. С. Сідорскі і М. Ф. Грынько. Выказана ўпэўненасць у тым, што больш як трохтысячны калектыў ААТ "Гомельшкло", выкарыстаўшы дадатковыя рэзервы вытворчасці, справіцца з пастаўленымі перад ім задачамі.

* * *

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь наведаў і папраўча-працоўную калонію — пасяленне № 21, якая знаходзіцца ў Веткаўскім раёне ў маляўнічым урочышчы "Шубіна". Тут адбываюць пакаранне згодна з прыгаворамі судоў 346 чалавек. 244 іх — жанчыны. Характэрная дэталь: увесь кантынгент асуджаных — і мужчыны і жанчыны — у большасці сваёй раней знаходзіўся ў іншых калоніях, дзе пануе жорсткі рэжым. Перад выхадам на волю пераведзены сюды, бо ўсвядомілі сваю віну і зрабілі правільны вывад — трэба выпраўляцца.

П. У. Шыпук цікавіўся дысцыплінай, умовамі пражывання і быту, харчаваннем асуджаных. Гэтыя пытанні ён высвятляў як у размовах з асуджанымі, так і ў начальніка калоніі Л. І. Зінкевіча і першага намесніка начальніка Гомельскага абласнога ўпраўлення па выкананню пакаранняў Камітэта па выкананню пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь А. М. Пралыгіна.

Калонія-пасяленне мае сваю падсобную гаспадарку, у якой сорак гектараў зямельных угоддзяў. Вырошчваюцца бульба, агуркі, памідоры, капуста, буракі, ёсць свінакомплекс. Дзейнічае швейная вытворчасць, устаноўка па вырабу круп... Усе асуджаныя маюць работу ў калектывах 25 саўгасаў і калгасаў Гомельскага і Веткаўскага раёнаў, будаўнічых, транспартных і іншых арганізацый. 72 чалавекі з ліку асуджаных жывуць у вёсках, дзе ім прадастаўлена работа жывёлаводаў, паляводаў ці механізатараў.

У асуджаных два водпускі на працягу года, на летнія канікулы яны могуць запрашаць сюды сваіх дзяцей. Вядома, што ўсё гэта прадугледжана для тых, хто добра сябе паводзіць.

— Вывад, які я зрабіў, — сказаў П. У. Шыпук, — наступны: калонія ў Шубіне працуе ў правільным накірунку, і гэта заслугоўвае пахвалы яе работнікаў, якіх можна параўнаць з педагогамі-выхавальнікамі. Але лічу, што заканадаўчыя органы павінны падумаць над тым, каб даць падобным установам льготы ў выглядзе крэдытаў ці субсідый для развіцця, як гэта робіцца для сельгаспрадпрыемстваў. Тады яны змогуць забяспечваць прадуктамі харчавання не толькі сябе, але і іншыя калоніі, якія знаходзяцца на ўтрыманні дзяржавы.

Уладзімір ГРЫГОР'ЕЎ, Сцяпан БАЛОТКІН.

Заява Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

У сувязі са спробай, зробленай асобнымі прафсаюзнымі лідэрамі, навязаць грамадскай думцы ў Беларусі і міжнароднаму супольніцтву беспадстаўны тэзіс аб ушчамленні правоў прафсаюзаў з боку органаў дзяржаўнай улады Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь заяўляе:

1. Дзяржава ў адпаведнасці з дзеючай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь стварае ўсе ўмовы для поўнай занятасці насельніцтва і з'яўляецца гарантам рэалізацыі правоў грамадзян на абарону сваіх эканамічных і сацыяльных інтарэсаў, у тым ліку пры дапамозе аб'яднання ў прафесійныя саюзы.

2. Дзяржава разглядае прафсаюзны рух у якасці важнага напрамку рэальнага забеспячэння абвешчаных Асноўным Законам правоў грамадзян на працу, адпачынак, выкананне прафесійных абавязкаў, атрыманне справядлівага ўзнагароджання за працу і іншых сацыяльных гарантый, што адпавядае задачам і мэтам дэмакратычнай прававой дзяржавы. У сваю чаргу, большасць кіраўнікоў і актывістаў прафсаюзных арганізацый усямерна садзейнічаюць вырашэнню актуальных сацыяльна-эканамічных задач краіны, садзейнічаюць умацаванню палітычнай стабільнасці ў грамадстве, на справе абараняюць правы і законныя інтарэсы працоўных, членаў сваіх працоўных калектываў.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

С ЮБИЛЕЕМ!

Народной артистке Республики Беларусь, артистке областного драматического театра КОРНЕЕВОЙ Нине Алексеевне

Глубокоуважаемая Нина Алексеевна!

Примите самые теплые и искренние поздравления с юбилеем!

Гомельщина, как и вся Республика Беларусь, гордится Вами — мастером сцены, жемчужиной национальной белорусской культуры.

Ваши высокие профессиональное исполнительское мастерство и гражданская позиция, горячее сердце, доброта, открытость души, энтузиазм и трудолюбие — слагаемые успеха, авторитета и признания не только зрителей Гомельщины, но и любителей театра далеко за ее пределами.

Выражаем огромную благодарность за Ваш талант и неоценимый труд по пропаганде лучших образцов театрального искусства, которые Вы так бережно и щедро на протяжении многих лет несете людям.

Низкий Вам поклон и пожелания неиссякаемой энергии и здоровья, счастливого долголетия, успехов в деле духовного обогащения нашего общества.

Председатель областного исполнительного комитета Н. Г. ВОЙТЕНКОВ.

Председатель областного Совета депутатов В. С. СЕЛИЦКИЙ.

Паведамленне

Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў

Цэнтральнай камісіяй Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў у адпаведнасці з Выбарчым Кодэксам Рэспублікі Беларусь створаны пазабюджэтны фонд для дадатковага фінансавання расходаў на падрыхтоўку і правядзенне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у 2000 годзе і адкрыты спецыяльны пазабюджэтны рахунак нумар 3314048180026 у філіяле нумар 512 акцыянернага ашчаднага банка "Беларусбанк", код 604 для добраахвотнага пералічэння ў яго грашовых сродкаў грамадскімі аб'яднаннямі, прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі і грамадзянамі Рэспублікі Беларусь.

Цэнтральная камісія звяртаецца да грамадскіх аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і грамадзян Рэспублікі Беларусь з просьбай прыняць удзел у фінансаванні выбарчай кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шляхам добраахвотнага пералічэння грашовых сродкаў у пазабюджэтны фонд на спецыяльны рахунак Цэнтральнай камісіі.

Юрыдычныя асобы, якія жадаюць прыняць удзел у дадатковым фінансаванні выбарчай кампаніі, могуць унесці грашовыя сродкі ў пазабюджэтны фонд шляхам іх пералічэння на названы спецыяльны пазабюджэтны рахунак у акцыянерным ашчадным банку "Беларусбанк" з указаннем поўнай назвы юрыдычнай асобы.

Добраахвотныя пералічэнні грашовых сродкаў у пазабюджэтны фонд ад грамадзян Рэспублікі Беларусь прымаюцца ва ўстановах акцыянернага ашчаднага банка "Беларусбанк" пры прад'яўленні пашпарту або іншага дакумента, што засведчвае асобу, з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, месца жыхарства грамадзяніна, які пералічыў грашовыя сродкі.

Не дапускаецца пералічэнне ў пазабюджэтны фонд бюджэтных сродкаў, а таксама грашовых сродкаў замежнымі дзяржавамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, замежнымі грамадзянамі, асобамі без грамадзянства, міжнароднымі арганізацыямі, прадпрыемствамі Рэспублікі Беларусь з замежнымі інвестыцыямі.

Сродкі пазабюджэтнага фонду маюць мэтавае прызначэнне і будуць выкарыстаны толькі на пакрыццё расходаў, звязаных з правядзеннем перадвыбарнай агітацыі кандыдатаў у дэпутаты, а таксама на набыццё неабходнага абсталявання для выбарчых камісій.

Адказная справа — выбары

Адна з асноўных падзей у грамадскім жыцці нашай краіны — прызначэнне даты выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Галасаванне адбудзецца 15 кастрычніка. Часу на правядзенне падрыхтоўчых мерапрыемстваў застаецца не так шмат — гэта думка была стрыжнявой на нарадзе, прысвечанай падрыхтоўцы і правядзенню выбараў, што праводзілася ў аблвыканкаме 19 ліпеня.

На нараду былі запрошаны намеснікі старшынь гаррайвыканкамаў па інфармаванню і сувязях з грамадскасцю, рэдактары газет.

Відавочна, што вялікія і адказныя задачы па растлумачэнню палажэнняў Выбарчага кодэкса, сутнасці ўнесеных у яго паправак ускладваюцца на інфармацыйныя структуры выканкамаў, электронныя і друкаваныя СМІ. Падрыхтоўка да выбараў і іх правядзенне, адзначыла загадчыца аддзела па інфармаванню насельніцтва і сувязях з грамадскасцю аблвыканкама В. М. Кашавенка, сур'ёзны і адказны экзамен. Тым больш, што па прагнозах сацыёлагаў сёлетнія выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу таксама будуць праходзіць у варунках высокай грамадска-палітычнай актыўнасці. Як паказалі апытанні, удзельнічаць у выбарах некалькі месяцаў таму выказвала жаданне каля 73 працэнтаў выбаршчыкаў. Хаця, згодна з апытаннем інстытута сацыяльна-палітычных даследванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта, палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі адметнай ролі ў палітычным жыцці рэгіёнаў не адыгрываюць. Між тым, тыя і другія, без сумнення, будуць аказваць свой уплыў на выбарчыя працэсы.

Газеты, радыё і тэлебачанне закліканы больш увагі ўдзяляць рабоце выбарчых камісій. У кожным рэгіёне павінны быць распрацаваны планы інфармацыйна-прапагандысцкай работы. Больш актыўна ў гэта павінен уцягвацца патэнцыял таварыства "Веды".

На пытаннях утварэння, паўнамоцтваў і арганізацыі работы выбарчых камісій засяродзіў увагу ўдзельнікаў нарады намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы А. Ф. Усаў. У першую чаргу з мэтай эканоміі сродкаў, адзначыў прамоўца, разам з выбарамі парламентарыяў будуць выбірацца дэпутаты абласнога і мясцовых Саветаў у чатырох акругах: у трох — на месца выбраннікаў, якія выбылі, а ў Алімпійскай выбарчай акрузе адбудуцца паўторныя выбары.

На матэрыялах грамадскіх даследванняў і распрацовак падпарадкаванага ведамства пабудаваў сваё выступленне дырэктар інстытута сацыяльна-палітычных даследванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Я. В. Матусевіч.

Нараду вёў намеснік старшыні аблвыканкама У. У. Давідовіч. У ёй удзельнічаў старшыня Дзяржкамітэта па друку М. В. Падгайны.

Мікола ВЕРАС.

І швец, і жнец...

Калгас "Ленінская іскра" Калінкавіцкага раёна мае, бадай, самыя вялікія плошчы заліўных лугоў — каля 800 гектараў. Шмат тут і іншых вялікіх выдаемаў, берагі якіх густа зараслі травамі. Правесці ўборку травастою тэхнікай — праблема цяжкавырашальная, тым больш сёння, калі дала сабе волю даждлівая непагадзь. Кінуць бы сюды людскія сілы, ды дзе ўзяць гэтыя рэзервы ў калгасе.

Але ж не пакідаць травы няўбранымі! Тым больш, што кожны дадатковы нарыхтаваны кілаграм іх узімку будзе, што называецца, залатым: з першага ўкосу ў калгасе нарыхтавана толькі 510 тон сена, што ў пераліку на ўмоўную галаву калгаснага статка складае ўсяго 2,5 цэнтнера кармавой адзінкі.

Вастрыню моманту, звязанага з ходам корманарыхтоўкі, тонка адчуваюць і ў Калінкавіцкім райвыканкаме. Але свой уплыў на ход гэтай адказнай акцыі тут вырашылі не абмяжоўваць суперажываннем ды нейкімі арганізацыйнымі мерапрыемствамі. Сфарміраваная старшынёй райвыканкама В. І. Піліпцом з ліку работнікаў апарата выканаўчага органа, аддзелаў адукацыі, унутраных спраў, падатковай інспекцыі і іншых раённых структур мабільная каманда колькасцю каля 400 чалавек 17 ліпеня выехала ў "Ленінскую іскру". Энтузіязму корманарыхтоўшчыкам прыдаваў асабісты ўдзел у ёй В. І. Піліпца. Справа знайшлася кожнаму: мужчыны касілі, а жанчыны выносілі скошанае на больш сухія месцы, да аўтамашын і трактараў. Па звестках, атрыманых у калгасе, толькі ў першы дзень "раённы дэсант" нарыхтаваў і даставіў да сіласных ямаў 70 тон зялёнай масы, а за два наступныя дні — яшчэ каля 150 тон.

20 ліпеня каманду корманарыхтоўшчыкаў замест В. І. Піліпца ўзначаліў старшыня раённага Савета дэпутатаў В. К. Рыльцоў.

З тым, хто прытрымліваецца погляду, што, маўляў, не "царская" гэта справа — самому кіраўніку раёна касу ў рукі браць, мушу не пагадзіцца. Па-першае, прынцып "Рабі, як я" заўсёды быў самым пераканаўчым агітацыйным і мабілізуючым аргументам у любой справе. Не гаворачы ўжо пра сёлетнюю экстрэмальную сітуацыю ў корманарыхтоўцы, дзе лішнія рабочыя рукі з'яўляюцца далёка не лішнімі.

Мікола ЖДАНОВІЧ.

Информация о надоях молока районами области на 20 июля 2000 года

Районы	Валовой надой (тонн) 2000 г.	Валовой надой (тонн) 1999 г.	%	Надой на корову (кг) 2000 г.	Надой на корову (кг) +- к 1999 г.
Брагинский	46,7	50	93	7,8	-0,5
Б-Кошелевский	94,2	99,6	95	6,3	-0,2
Ветковский	52,3	60,6	96	8,2	-0,9
Гомельский	107,3	102,5	105	8,3	0,4
Добрушский	85,6	87,7	98	7,8	-0,2
Ельский	62,7	61,4	102	9	0,1
Житковичский	51	51,8	98	5,9	-0,1
Жлобинский	109,7	125,3	88	6,8	-1
Калинковичский	93,9	102,7	91	7,2	-0,8
Кормянский	43,6	47,3	92	7,8	-0,7
Лельчицкий	40,2	44,6	90	5,4	-0,6
Лоевский	47,1	54,2	87	7,1	-1,1
Мозырский	51,8	49,5	105	6,8	0,5
Наровлянский	11,6	11,4	102	7	-0,5
Октябрьский	46,5	45,8	102	6	0,4
Петриковский	67,3	69,1	97	5,4	-0,2
Речицкий	115,6	127,4	91	7,6	-0,7
Рогачевский	116,7	126	93	6,5	-0,4
Светлогорский	58,3	64,6	90	6,8	-0,6
Хойникский	57,3	56,4	102	9,2	0,1
Чечерский	32,3	35,2	92	6,8	
По области:	1391,7	1473,1	94	7,01	0,39

Облсельхозпрод.

Поздравляем!

За многолетний добросовестный труд и достижение высоких производственных показателей Почетной грамотой облисполкома награжден Вадим Владимирович ФИЛИППОВ — генеральный директор республиканского унитарного предприятия "Белорусский металлургический завод".

* * *

За многолетний добросовестный труд и в связи с 50-летием со дня рождения Почетной грамотой областного Совета депутатов награждена ЛЕПСКАЯ Людмила Васильевна — заведующая канцелярией Гомельского отдела внутренних дел на транспорте.

* * *

За многолетний добросовестный труд и значительные успехи в организации учебно-воспитательного процесса Почетной грамотой областного Совета депутатов награждены:

ВАБИЩЕВИЧ Владимир Николаевич — руководитель туристического кружка Копаткевичского центра внешкольной работы Петриковского района

ЗЕНКЕВИЧ Петр Федорович — директор Бабуничской средней школы Петриковского района.

8-тысячны нумар газеты "Светлае жыццё"

"Светлае жыццё" — такую натхнёную назву мае лельчыцкая раённая газета. У яе рэдакцыі працуе творчы, таленавіты калектыў. Газета неаднаразова станавілася пераможцам розных конкурсаў. Так і трымаць!

Наступнай вясною газета адзначыць 70-годдзе, а сёння ў свет выйшаў 8-тысячны нумар. Сакратарыят абласной арганізацыі Беларускага саюза журналістаў і рэдакцыя "Гомельскай праўды" шчыра віншуюць са знамянальнай падзеяй калектыў рэдакцыйна-паліграфічнага прадпрыемства "Светлае жыццё", аўтарскі актыў, чытачоў газеты і жадаюць усім моцнага здароўя, вялікага шчасця, дабрабыту і новых творчых поспехаў на карысць роднага краю!

Новобранцы, под ружье!

В штатном учебном пункте при УВД облисполкома прошел очередной выпуск слушателей первоначальной подготовки. Четыре месяца 60 новобранцев патрульно-постовой службы милиции из горрайорганов внутренних дел области прошли обучение по 14 дисциплинам — от уголовного права до приемов самообороны. После сдачи зачетов и экзаменов они получили свидетельства, подтверждающие право на хранение и ношение боевого оружия, и допуск к самостоятельному несению службы.

Л. МАЙСЕЙКОВА.

За рубежом

Большая Восьмерка готовится к саммиту

В Японии, на острове Окинава, проходит саммит стран Большой Восьмерки. Главная тема повестки дня — обсуждение результатов международных финансовых реформ, необходимость проведения которых была вызвана финансовым кризисом в странах Азии в конце девяностых годов. Лидеры семи ведущих индустриальных стран обсудят отчет, составленный министрами финансов, в котором говорится, что для предотвращения повторения аналогичного кризиса необходимы более эффективные действия. По завершении этой дискуссии к странам Большой Семерки присоединится Россия.

Жители Окинавы против американских баз

По прибытии на Окинаву президент Клинтон принял участие в церемонии возложения венков у памятника десяткам тысяч погибших в битве за Окинаву в конце второй мировой войны. Клинтон сказал, что США сознают, что американское военное присутствие на Окинаве сопряжено с определенными обязательствами по отношению к жителям острова. В четверг тысячи местных жителей вышли на демонстрацию протеста против американского военного присутствия: взявшись за руки, они образовали живую цепь вокруг крупнейшей американской военной базы.

Сербы Косово протестуют

В Косово сербская община угрожает продолжать демонстрации протеста и беспорядки, невзирая на то, что арестованный ранее сербский активист Далибор Вукович освобожден под залог. Вуковича обвиняют в нападениях на косовских албанцев. Его арест в разделенном городе Митировице вызвал волну насилия и беспорядков. Около тысячи сербских жителей города собрались, чтобы отпраздновать его освобождение.

Конгрессмены за смягчение санкций против Кубы

Палата представителей американского Конгресса проголосовала за ослабление санкций против Кубы, которые были введены против коммунистического режима Кастро почти сорок лет назад. Конгрессмены одобрили предложения, касающиеся смягчения ограничений на поездки граждан США на Кубу и снятия санкций на поставки продовольствия и медикаментов.

США не собираются оказывать помощь афганской оппозиции

Заместитель госсекретаря США Карл Индерферт категорически отверг идею оказания военной помощи оппозиционным силам Афганистана, сражающимся на севере страны против режима ультра-религиозного исламского движения Талибан. По его словам, это бы означало повторное военное вовлечение Соединенных Штатов в войну в Афганистане. Многие американские политики, возмущенные положением с правами человека в Афганистане, требуют, чтобы Вашингтон поддержал афганскую оппозицию.

Исследования причин геноцида

В Великобритании открывается первый в мире исследовательский институт по изучению причин, приводящих к геноциду. В лондонском центре будут работать ученые из разных стран. Одна из целей исследований — понять, какие факторы приводят к геноциду с тем, чтобы можно было разработать систему раннего опознавания опасности геноцида.

Великобритания и права человека

Международная правозащитная организация Amnesty International (Международная Амнистия) критически отозвалась о достижениях британского правительства в отношении защиты прав человека в мире. По словам представительницы организации Кейт Аллен, хотя лейбористское правительство Тони Блэра и уделяет больше внимание этой теме, политика Великобритании остается непоследовательной, и в ряде случаев приоритет отдается не правам человека, а коммерческим соображениям.

По сообщениям информационных агентств.

Читатели, выписавшие "ГП" по индексу 63841, получают этот номер с приложением "ВСТРЕЧНАЯ ПОЛОСА"


ВСТРЕЧА




"Чтоб раздавать целковые добра, беря взамен полушками успеха..."









"Да, я получила все, но этого мне мало, я хочу играть и работать над новыми ролями. Не могу и не хочу угомониться".

Даже если бы я не знала, что автор этой цитаты — моя любимая актриса областного драматического театра, народная артистка Беларуси Нина Алексеевна Корнеева, я бы ее "вычислила". Просто она единственная из моих знакомых, людей творческих профессий, кто может сказать — я получила все... За этими словами, прежде всего, признание таланта, востребованность зрителями, высокая оценка ее заслуг.

У Нины Алексеевны есть роли, которые не только мне, но и многим помнятся до мельчайших подробностей. Часто в памяти всплывает созданный ею образ Софьи Ивановны в спектакле "Семейный альбом" Н. Птушкиной, поставленный несколько месяцев назад в Молодежном театре-студии. И будто слышу голос мудрой, доброй женщины, которая с возрастом не растеряла наивной веры в милосердие и справедливость, осталась по-детски чистой, по-юношески оптимистичной. После премьеры многие поздравляли Нину Алексеевну, искренне радуясь успеху. Было очевидно, что большой запас душевной щедрости, добра и любви к людям, что накопила актриса за свою долгую творческую жизнь, просто выплеснулся в этой роли. Это тот случай, когда говорят — артист не играет, он живет, а вернее, проживает на сцене кусочек жизни своего героя. Нина Алексеевна часто про себя повторяет слова Софьи Ивановны, размышляя над теми или иными ситуациями, что подбрасывала жизнь ее героине. О таких, как Корнеева, говорят — родилась артисткой. В их маленьком городке Ртищево, что между Москвой и Саратовом, театра не было. Но ее отец, ученик знаменитого актера Саратовской драмы и просто талантливый человек, создал театр из местной интеллигенции в их небольшом городке.

— Я бегала на спектакли тайно, иногда через окно вылезала, чтобы бабушка не видела, — вспоминает Нина Алексеевна. — Сидела в театре (бывшей церкви) на полу и забывала, что Незнамов — мой отец. Я сочувствовала ему, я любила его, так же, как Фердинанда в "Коварстве и любви". Но как же я ненавидела его, когда он играл Иудушку Головлева, я не хотела его видеть, если встречала в городе, то перебегала на другую сторону улицы...

Вот так с давних времен и по сей день пленяет ее сцена. Хотя жизнь делала свои зигзаги и не сразу Нина Алексеевна разобралась, что поступать ей надо только в театральный. Первым вузом в ее жизни был плодово-ягодный институт имени И. Мичурина. Но вечера самодеятельности, драмкружок, хор без активистки Корнеевой не обходились. Она же таким образом приближалась к своей мечте, к театру.

У каждого человека в жизни есть судьбоносные события. Об одном из них Нина Алексеевна вспоминает всю жизнь. Ее великолепная память сохранила тот день, 3 марта 1943 года, до мельчайших подробностей. Это было в Барнауле. Она, уже дипломированный агроном, сама того не подозревая, держала экзамен в студию Камерного театра. Устроил эти экзамены корреспондент "Комсомольской правды" Василий Ильич Виноградов, который хорошо знал, что сама она вряд ли решится на такой шаг. Но он-то понимал, в чем ее призвание, сказал как бы между прочим: мол, договорился с актерами, чтобы ее прослушали. Много лет спустя в своей книге "Театр в моей жизни" она написала: **"До сих пор я удивляюсь этому чуду. Чудо, что поступила, чудо, что стала актрисой. Никогда не пожалела об этом. И все годы я благодарила человека, который понял меня в далеком 1943 году и принял участие в моей судьбе".**

О таких учителях сцены можно было только мечтать: знаменитый режиссер Камерного театра — Александр Яковлевич Таиров, известная актриса Алиса Георгиевна Коонен... Именно Таиров напророчил ей прекрасную актерскую карьеру такими словами: "Деточка, у вас большой диапазон, вы будете играть все — от детей до старух, и девушек самых разных, но успех к вам придет к сорока годам в пьесах Островского". Так оно и случилось в ее актерской судьбе.

Она впитывала в себя лучшие спектакли любимых своих театров — МХАТа и Малого, восторженными глазами следя за игрой таких мэтров, как Яншин, Грибов, Хмелев, Качалов, Тарасова, Книппер-Чехова, Прудкин. Они были ее современниками.

Теперь, накануне 80-летнего юбилея, все чаще припоминаются вопросы, десятки раз ей адресованные: "Легко ли быть актрисой? И что же это за профессия?"

Она уже хорошо знает на них ответы.

— Наверное, это профессия ущемленного самолюбия. Ведь нигде, никому не скажут, что вы не можете работать в школе, в больнице, на заводе потому, что у вас непропорциональная фигура, кривые ноги, некрасивый нос, что ваша внешность не подходит... А будущему актеру скажут! И даже уже состоявшемуся скажут: Нину Заречную и Ларису Огудалову вы, дорогая моя, играть не будете... Но если ты любишь театр до фанатизма — все стерпишь. Бабу-Ягу — так Бабу-Ягу, эпизод — так эпизод, можно и на "кушать подано", лишь бы выходить на сцену, лишь бы быть в театре.

Много лет зная Нину Алексеевну, я часто задаю себе один и тот же вопрос: что же преобладает в ее характере? Неуемная жажда жизни? Желание везде успеть? Интерес ко всему, что вокруг происходит? Как-то в зимний морозный день позвонила ей и не застала дома. Говорят — в гости к друзьям поехала, в Москву. В ее-то годы, в такую погоду! И невольно становится неловко за собственное нытье — такой пример перед глазами! Какой бы коллектив ни пригласил ее на то или иное торжество — идет по первому зову. Очень любит читать юмористические рассказы. Такая любовь у нее с молодости. Позовут в школу, и туда с охотой идет, с особым настроением.

— Может, вот эти притихшие школьники, впервые услышавшие от меня, что такое театр, что это за слово, наше ли оно, или пришедшее из древности, из другого государства, может быть, они, никогда не бывавшие в театре, после нашей встречи пойдут в него, полюбят его, и он войдет в их души, как нечто волшебное, облагораживающее эту самую душу. Может, и мысли их станут лучше, благороднее?

Она не просто ждет, когда ее куда-либо пригласят. Нередко инициатива исходит от нее самой. Как, впрочем, и в театре. Вряд ли родились бы ее моноспектакли последних лет — "Юмор спасет мир", "Истории любви", если бы она сама не предложила режиссеру их видение.

Несколько дней назад, приехав с гастролей из Гродно, чуть было не заскучала, да собралась с духом и выступила перед ветеранами со спектаклем "Юмор спасет мир". Сколько улыбок видела на лицах пожилых людей! Еще больше сама радовалась, что приятные минуты людям подарила.

Так чего же в ней больше? Как божий день ясно — жизни! Помните у поэта: "Ненавижу всяческую мертвячину, обожаю всяческую жизнь!". Она была такой жизнелюбкой и заводилой всегда. В юности могла, не имея понятия о балете, принять участие в балетных танцах и сорвать аплодисменты. Она могла без удержу плясать на Красной площади в День Победы несколько часов подряд. Она мастерица на разные розыгрыши, ибо озорство, жажда жизни всегда в ней бьют через край.

Года три назад она написала книгу "Театр в моей жизни". Такое ей было поручение коллег, как одной из старейших актрис театра. И приняла это поручение близко к душе.

— Профессия актера особенная. После художника остаются картины, после композитора — музыка, после скульптора — его работы. Актер же уходит из жизни, и после него не остается ничего. Особенно если он актер провинциального театра. Его знал зритель этого города, восхищался им, плакал и смеялся от его игры, но вот ушел актер в небытие, и через некоторое время о нем забывают.

Написав книгу, я в какой-то степени выполнила долг перед товарищами, которых нет, но которые в меру своего таланта отдавали себя театру, ибо он был их жизнью.

Это о них эти поэтические строки, о лицедеях, которые и живут на сцене, "...чтобы их несочиненная игра была б до слез или была б до смеха, чтоб раздавать целковые добра, беря взамен полушками успеха". Да, безусловно, любому артисту и полушка успеха — радость. Ей же, народной артистке Беларуси, выпало значительно большее. Но она, начиная работу над той или иной ролью, никогда не задумывалась о конечном результате, об успехе. Она любила и по сей день любит сам процесс работы. В этом, считает актриса, суть профессии:

— Так и должно быть. Человек, решивший стать актером, должен быть готов к упорному, даже мучительному труду. Он должен неустанно заботиться о сохранении своей профессиональной формы, своей техники, совершенствовать свои знания...

Всему этому она соответствует. И театр для нее — прежде всего. Он ее властелин и Бог. Она играла спектакль даже тогда, когда в квартире лежал мертвый муж, ведущий актер театра Дмитрий Сергеевич Васильев, с которым в любви и согласии было прожито 27 лет.

Сорок три года жизни отдано Гомельскому областному драматическому театру. У нее есть свой зритель, который идет именно на Корнееву. И ей еще хочется долго радовать своих театралов, людей, которые ее любят. Незадолго до своего юбилея она получила из своего родного Ртищева послание от племянницы Ларисы. Та написала: "Все тебе будут желать дожить до 100 лет. Ты не отказывайся. Дожила же Изабелла Юрьева. А чем ты хуже?" Посмеялась от души Нина Алексеевна над этими словами, мысленно поблагодарила племянницу за тонкий юмор и чистосердечное пожелание. Хорошо бы реализовать его! И сразу наметила план "действий" на послеюбилейные дни. Во-первых, поехать в Москву. Там много друзей осталось. Очень хочется повидаться с Юрием Андреевичем Орлянским, в прошлом главным режиссером Гомельского облдраматеатра. При встрече они могут проговорить, не вставая с места, восемь часов.

Ну а дальше она поедет в Ртищево, к родным корням, к своим истокам, почерпнуть сил и бодрости. А пока — суета. Ведь завтра — юбилей. Она счастлива. Рядом — взрослые любимые внуки, дочь, зять, друзья. И пусть будет так, как [illegible] Нина Алексеевна [illegible] участие в праздновании 30-летнего юбилея Камерного театра. Кукла Сергея Образцова пела романс: "Налей бокал, в нем нет вина, [illegible] юбилея!"

Алина КЛЫГА.

НА СНИМКАХ: Н. Корнеева в ролях разных лет.

В школу — без сигарет

Курение среди несовершеннолетних сегодня стало настоящей бедой, на которую в нашей стране в последнее время обратили серьезное внимание. В прошлом году, например, создана Коалиция по предотвращению этой пагубной привычки среди подростков. Было объявлено об участии в Коалиции еще трех новых членов: Администрации Президента Республики Беларусь, Министерства образования и совместного предприятия "Табак-инвест".

Как вести эту работу дальше? Что может сделать Коалиция для предотвращения курения молодым поколением? Эти и другие вопросы стали темой серьезного разговора на прошедшей в Минске пресс-конференции представителей Коалиции. Как отметил помощник Президента по связям с общественными организациями и политическими партиями Сергей Посохов, проведенные в течение года исследования выявили проблемы. Нужны политические меры в этой работе, чтобы осуществить в стране программу здоровья нации и здорового образа жизни. Достичь желаемого можно только объединив усилия общественности, средств массовой информации, учебных заведений и школ, предпринимателей, предприятий торговли и представительств местных табачных фирм.

По настоянию Коалиции, сказал на пресс-конференции управляющий корпоративным отделом представительства "Филип Моррис" в Беларуси Игорь Алькимович, намечены и уже разработаны программы для школьников, широкие рекламные кампании против курения подростков, включающие рекламные телеролики. Они появятся на телеэкране после окончания школьных каникул.

В обсуждении темы курения среди подростков участвовали заместитель министра образования Олег Слука, начальник отдела защиты прав потребителей и контроля Министерства предпринимательства и инвестиций Александр Пахомов, заместитель директора табачной фабрики "Неман" Игорь Кочанков и другие.

Николай ДЕГТЯРЕВ.

БИЗНЕС

Проект МФК начинает новую жизнь

С 1 июня 2000 года в г. Гомеле начал работать новый проект Международной финансовой корпорации "Развитие малого и среднего бизнеса в Беларуси". Этот проект МФК остается единственным, после того, как с 30 апреля координационным центром МФК объявлено о завершении собственного проекта "Малая приватизация в Беларуси". Как отметил руководитель проекта Карл Дагенхардт, проект МФК "Малая приватизация в Беларуси" в основном достиг поставленных целей — в торговле и общественном питании создана своего рода "критическая масса" негосударственных предприятий, что способствует развитию конкуренции, положительно влияет на создание рыночной среды.

По данным Мингосимущества, к моменту завершения проекта всего по республике приватизировано: в торговле — 70 процентов, в сфере общественного питания — 51 процент и 36 процентов объектов бытового обслуживания.

Программа поддержки малой приватизации МФК работала, в основном, на городском рынке коммунальной собственности. Приватизировано 66 процентов планируемого объема. В сферах объектов торговли программа выполнена на 79 процентов, общественного питания — на 56 и бытового обслуживания — на 47 процентов.

В целом по стране доля малых и средних предприятий на сегодняшний день составляет лишь 9 процентов. На негосударственных малых предприятиях занято около 7 процентов трудоспособного населения. Для сравнения: в странах Европейского Союза на малых и средних предприятиях занято 60 — 70 процентов населения, а на их долю приходится около 60 процентов всего товарооборота.

По состоянию на 1 января 2000 г. в Гомеле зарегистрирован 19391 субъект малого предпринимательства, в том числе коммерческие структуры составили 3029, предпринимателей без права юридического лица 16362. Занято в этой сфере 55 тысяч человек, что составляет 8,4 процента от общей численности занятых в народном хозяйстве. Негосударственный сектор в городе представлен более чем 7000 индивидуальных предпринимателей и около 2000 юридических лиц.

